Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-06-21

# Сакрэт поспеху — у адданасці любімай справе

**Пераможцай V Рэспубліканскага конкурсу школьных праектаў па эканоміі і беражлівасці "Энергамарафон-2011" у намінацыі "Лепшы педагог па арганізацыі работы па выхаванні культуры энергазберажэння вучняў" стала настаўніца хіміі сярэдняй школы № 3 Асіповіч Магілёўскай вобласці Святлана Уладзіміраўна Зайцава. Перамогу гэтага педагога нельга назваць выпадковай, паколькі поспехі вучняў, як вядома, у многім залежаць ад асобы настаўніка, яго прафесіяналізму, творчасці, ініцыятыўнасці, жадання і ўмення раскрыць асобу дзіцяці. С.У.Зайцавай уласцівы ўсе пералічаныя якасці. Акрамя таго, Святлана Уладзіміраўна двойчы была адзначана падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца лаўрэатам прэміі Магілёўскага аблвыканкама "Чалавек года" і Першага экалагічнага форуму.**

Пятнаццаць гадоў назад педагог наладзіла супрацоўніцтва з Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэтам імя А.Д.Сахарава, Нацыянальнай акадэміяй навук, Беларускім дзяржаўным універсітэтам і міжнароднымі экалагічнымі аб'яднаннямі з мэтай арганізацыі экспедыцый і стварэння вучнёўскіх праектаў па праблемах экалогіі і рэсурсазберажэння. Экалагічнае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Дзеля жыцця на Зямлі", якое С.У.Зайцава стварыла ў асіповіцкай сярэдняй школе № 3, добра вядома ва ўсёй краіне. У рамках работы гэтага аб'яднання былі распрацаваны праекты "Энергаэфектыўны клас — энергаэфектыўная школа", "Энергазберажэнне — самы просты спосаб захаваць прыроду", "Адходы — у даходы", "Экалагічная асвета насельніцтва", а таксама выдадзены наступныя кнігі: "Унікальныя прыродныя аб'екты Асіповіцкага краю", "Экалагічны маніторынг Асіповіцкага раёна: методыкі, вынікі даследаванняў, ацэнка стану", "Развіццё экалагічнага турызму Асіповіцка-Жорнаўскага напрамку", "Біяэнергетыка Асіповіцкага раёна", "Турыстычна-краязнаўчая дзейнасць па вывучэнні і захаванні роднага краю", "Чырвоная кніга Асіповіцкага раёна. Расліны", "Чырвоная кніга Асіповіцкага раёна. Жывёлы".

Вынікі экалагічных экспедыцый і навуковых даследаванняў настаўніцы і вучняў былі запатрабаваны і пры публікацыі шматтомнага выдання "Флора Беларусі. Мохападобныя" (3-е выданне Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь).

Па выніках абароны навукова-даследчых работ за апошніх 5 гадоў члены экалагічнага маладзёжнага аб'яднання "Дзеля жыцця на Зямлі" заваявалі 229 дыпломаў (167 з іх — рэспубліканскага ўзроўню), атрымалі 15 прэмій спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, сталі ўладальнікамі трох міжнародных малых грантаў, лаўрэатамі І Рэспубліканскага экалагічнага форуму, тройчы былі адзначаны гран-пры на рэспубліканскіх конкурсах.

Юныя эколагі з сярэдняй школы № 3 Асіповіч упэўнена выступалі на міжнародных канферэнцыях маладых вучоных у Чэхіі, Галандыі, Германіі, Польшчы, Расіі, Швецыі, па выніках якіх былі ўзнагароджаны 11 міжнароднымі дыпломамі і 12 медалямі.

Святлана Уладзіміраўна распрацавала метадычныя рэкамендацыі па навучанні асновам энергаэфектыўнасці на ўроках геаграфіі, хіміі, фізікі і біялогіі "Адукацыйная праграма навучання школьнікаў энергазберажэнню" для вучняў 5—8 класаў. Педагогу належыць і аўтарства праекта аб музеі энергазберажэння. Плануецца, што музей будзе функцыянаваць як вучэбна-метадычны і арганізацыйна-масавы цэнтр па развіцці ў вучняў, настаўнікаў і бацькоў Асіповіцкага раёна навыкаў эканоміі і беражлівасці, а таксама энергаэфектыўнага спажывання энергіі, цяпла і вады.

Навукова-даследчая дзейнасць у школьным узросце паўплывала на прафесійны выбар многіх выпускнікоў школы № 3 Асіповіч: яны працягваюць займацца навукай і ў ВНУ, працуюць у НАН Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца спецыялістамі вядучых устаноў і прадпрыемстваў нашай краіны.

Увогуле, у Магілёўскай вобласці створана зладжаная сістэма навучання энергазберажэнню. У раёнах вызначаны апорныя школы, на базе якіх функцыянуюць практычныя цэнтры па пытаннях энергазберажэння, а ўдзельнікі штогадовага конкурсу "Энергамарафон" дэманструюць высокі ўзровень падрыхтаванасці і зацікаўленасці ў пытаннях экалогіі, энерга- і рэсурсазберажэння. Сёлета Магілёўшчына таксама перамагла ў названым конкурсе ў намінацыі "Лепшая вобласць па арганізацыі работы ўстаноў адукацыі ў сферы энерга- і рэсурсазберажэння".

**Дзіяна ЛУСЦЯНКОВА.**